# IV

# 1949 ГОД: НАПРУЖАНАЕ ЧАКАНЬНЕ

- Насустрач Новаму.
- Міжнароднае палітычна-ідэялягічнае супрацьстаяньне.
- Выпісы зь дзёньнікаў і лістоў.
- „Вератні” – сакрэтная дамова.
- Скандал! – Бута жэніцца!!!
- Мы наперадзе 30-ці кандыдатаў.
- У Лёндане.
- На даляглядзе – Бэльгія!!!
- У дарозе назад на кантынэнт.

## Насустрач Новаму

Настаў Новы 1949 год. Чаго было ад яго спадзявацца? Ці дасьць ён нам студэнцкую кніжку заміж шахцёрскай кіркі? Можа й дасьць! Галоўнае хацець, чакаць, спадзявацца й працаваць на гэта. Ня падаць духам. Пад такім настроем, і зь неадступнай думкай пра Беларусь, я напісаў верш „Насустрач Новаму”.

У далёкіх лясох прамаўчаў заінелымі ўсьмешкамі,
грознай сьцюжаю дзьмухнуў у куцыя хаты,
расчасаў бараду, зь дзетварой перакінуўся сьнежкамі
і у хмельныя ночы шпурнуў серабрыстае ваты…

Тут праплакаў дажджом, пракульгаў падмарожанай раніцай,
прабаваў усьміхнуцца ў дымы і туманы…
Там і тут адыйшоў – аб жыцьці можа нашым параіцца? –
і вясёлы, і сумны, цьвярозы і п’яны…

Мо хто лічыць гады?.. Мо хто борздага бегу лякаецца?..

Можа некаму страшна ад новай сустрэчы?..
Зрэшты, што нам да іх ? – Мы ня будзем за прошлае каяцца:
Нам вятры і жыцьцё дзьмулі ў грудзі і ў твар, а ня ў плечы.

Дык уздымем каўшы з брагай працы,
змаганьня й бадзёрасьці!
Хай баёвы нам марш будзе песьняй застольнай.
З новых шэранькіх дзён мы пашыема кліч свой вузорысты –
Новы Год – новы крок да Рэспублікі Вольнай!

У далёкіх лясох хай усьмешкі вісяць аб'інелыя...
Тут хай раніцы ціха кульгаюць у далі.
Мы і ў гэтыя дні пойдзем дружна — нястрымныя, сьмелыя,
будзем брагу асушваць і душы выкоўваць са сталі.

„Наперад!" №16, студзень 1949

## Міжнароднае палітычна-ідэялягічнае супрацьстаяньне

Занятыя сваім штодзённым шахцёрскім бытам і выдаваньнем часапісу, мы чакалі таго таямнічага заўтра, якое павінна будзе зьначыць наш лёс, і адчувалі, што трэба рыхтавацца да вялікіх падзеяў. Пра гэта сьведчылі зарніцы на міжнародным даляглядзе — узаемныя абвінавачаньні дзьвюх звышдзяржаваў паабапал глыбокай ідэйна-палітычнай прорвы.

Ператрэсеная й перакроеная вайной Эўропа бурліла канфліктнымі падзеямі й грознымі заявамі дзяржаўных лідэраў пад адрасам супрацьлеглага лягеру. У студзені 1948 г. брытанскі прэм'ер Клемэнт Этлі абвінаваціў Маскву ў пагрозе эўрапейскаму кантынэнту „новым імпэрыялізмам". Асноваў для такой заявы было дастаткова. На ўсходнім баку „жалезнай заслоны" ішоў камуністычны наступ на дэмакратыю. У Чэхаславаччыне, захапіўшы ўладу, камуністы забаранілі тварэньне новых палітычных партыяў. Пратэст з боку заходніх сталіцаў ніякага выніку ня даў. Чэхаславацкага міністра замежных справаў Яна Масарыка, які думаў, што дэмакратычныя інстытуцыі выжывуць пры новым рэжыме, знайшлі мёртвага пад вакном ягонае кватэры. Хутка пасьля гэтага прэзыдэнт краіны Эдуард Бэнэш, спадзяваньні якога, што перамога над фашызмам прынясе свабоду, ня збыліся, падаў у адстаўку, адмовіўшыся падпісаць камуністычную канстытуцыю.

Спрэчкі паміж заходнімі альянтамі й савецкім камандаваньнем у Бэрлінскай супольнай камісіі завастрыліся вакол савецкага кантролю цягнікоў, што йшлі з Захаду ў Бэрлін праз тэрыторыю Ўсходняй Нямеччыны. Масква спрабавала выціснуць сваіх учарашніх саюзьнікаў з Бэрліну. Адной з прычынаў гэтага былі масавыя ўцёкі людзей з Усходняе Нямеччыны на Захад.

У адказ на ўзмацненьне савецкага кантролю над доступам да Бэрліну Злучаныя Штаты пачалі ў красавіку 1948 г. завозіць харчы й паліва ў горад самалётамі – праз „паветраны мост”. У чэрвені Саветы ўзмоцнілі наземную блякаду Бэрліну. „Паветраны мост” стаўся месцам і сымбалем напружанага супрацьстаяньня паміж заходнімі альянтамі й Савецкім Саюзам. Пытаньне Бэрліну было пастаўленае на парадак дня ААН. Але Масква наклала вэта на пастанову ААН, якая патрабавала спыненьня блякады. Прэзыдэнт ЗША Трумэн адмовіўся весьці перамовы чатырох дзяржаваў, што кантралявалі акупаваны Бэрлін, да часу, пакуль ня будзе зьнятая блякада. Скончылася тым, што Саветы замацавалі падзел Бэрліну на ўсходні й заходні, устанавіўшы ў сваім сэктары асобную адміністрацыю.

Тым часам у Грэцыі пачалася грамадзянская вайна ў выніку намаганьняў камуністаў захапіць уладу. У Італіі стрэл у лідэра кампарыі Пальміра Тальяты выклікаў закалоты па цэлай краіне. Югаслаўскі лідэр Ёсіп Тыта, парваўшы са Сталінам, абвінаваціў падуладны Маскве Камінформ у падтрымваньні грамадзянскіх войнаў. Напружаньне расло. У кастрычніку былы брытанскі прэм’ер Чэрчыль у палымянай прамове сказаў, што толькі атамная бомба стаіць паміж свабодай і камуністычным паняволеньнем.

Разгарнулася паўсюднае паляваньне на шпіёнаў. У Чэхаславаччыне былі арыштаваныя больш за 70 асобаў як „амэрыканскія агенты”. Улетку ў Амэрыцы ўзмоцнілася ліхаманка шуканьня затоеных „камуністаў” ды іхных сымпатыкаў. І хоць Прэзыдэнт Трумэн асудзіў допыты, праводжаныя кангрэсавай камісіяй на чале з сэнатарам Джозэфам Макарты, антыкамуністычная кампанія яшчэ доўга працягвалася.

У студзені-лютым 1949 г. у Чэхіі ўлады пасадзілі за краты 60 асобаў як агентаў „амэрыканскага імпэрыялізму”. У Польшчы 200 былых вайскоўцаў былі арыштаваныя й абвінавачаныя ў антыўрадавай змове. У Вугоршчыне кардынала Міндсэнты, абвінавачанага ў канспірацыі супраць рэжыму, засудзілі на пажыцьцёвае зьняволеньне. Кардынал выратаваўся ад турмы ўцёкамі на тэрыторыю амэрыканскага пасольства. Вашынгтон, са свайго боку, абвінаваціў Маскву ў трыманьні ад 8 да 14 міліёнаў людзей у лягерох прымусовае працы. У гэткай атмасфэры бэрлінскі „паветраны мост” пратрываў восем месяцаў і каштаваў альянтам 200 міліёнаў даляраў ды 55 жыцьцяў, страчаных у нешчасьлівых выпадках пры пасадцы самалётаў.

У сакавіку 1949 г. Чэрчыль паўтарыў сваю перасьцярогу перад савецкай агрэсіяй: сказаў, што толькі атамная бомба можа не дапусьціць да савецкага захопу Эўропы. У падтрыманьне Чэрчылявых словаў прэзыдэнт Трумэн заявіў, што ён ня будзе вагацца, калі настане неабходнасьць ужыць такую зброю. У красавіку-травені Злучаныя Штаты й 12 саюзных дзяржаваў заснавалі ваенны саюз – Паўночна-Атлянтычны Пакт (НАТО). Сталін жа набыў сабе таксама альянта — пераможны лідэр кітайскіх камуністаў Мао Цэдун абвесьціў Маскву запраўдным саюзьнікам Пэкіну.

Не засталіся стаяць збоку праваслаўная й каталіцкая цэрквы: тым

часам як Крэмль паставіў на службу савецкай прапаганды „міру” Маскоўскую патрыярхію, Ватыкан прыгразіў анатэмай каталіком, якія бароняць й пашыраюць атэістычную дактрыну. Прывід камунізму павіс, здавалася, над цэлай Эўропай. У францускай асамблеі, дзе камуністы мелі моцны голас, дайшло да кулачных сутычак у часе абмяркоўваньня пастановы аб далучэньні Фанцыі да НАТО.

Учарашнія саюзьнікі сталіся ворагамі, а ворагі рабіліся саюзьнікамі: у Нямеччыне тры міліёны былых нацыстаў атрымалі ад дэмакратаў права галасаваць, а Савецкі Саюз, адклікаўшы свайго пасла зь Белграду, падцягнуў тры дывізіі войска бліжэй да мяжы камуністычнай Югаславіі. У адказ на гэта ЗША прызналі Белграду 20 міліёнаў даляраў дапамогі.

Усе гэтыя ды падобныя да іх падзеі разыходзіліся шырокім рэхам па сьвеце й асабліва голасна адгукаліся ў эміграцыйным друку. Праўда, у нашай сьведамасьці яны прыглушваліся ў ладнай меры бытавымі штадзённымі клопатамі ды вымогамі шэрай працы як у шахце, гэтак і вакол выдаваньня часапісу.

## Выпісы зь дзёньнікаў і лістоў

Займаючыся карэспандэнцыяй ад імя рэдкалегіі „Наперад!”, я вёў улік: што каму выслана ды што ад каго прыйшло. Для гэтага вёўся асобны дзёньнік. Запісы ў ім ляканічныя, канцылярскія. Часамі запісваў некаторыя падзеі ды здарэньні: зборкі Дванаццаткі, падарожжы сяброў на зьезды, нарады, сустрэчы зь беларускімі дзеячамі ды падобнае. Дзёньнік дае ўяўленьне пра наш грамадзкі занятак, а таксама сувязь, якую мы трымалі зь беларускімі асяродкамі па цэлым сьвеце: называюцца беларускія пэрыёдыкі, прозьвішчы супрацоўнікаў часапісу „Наперад!”; падаюцца некаторыя бартэрныя разьлікі за друкаваную ў Нямеччыне вокладку „Наперадu”; відзён працэс перасяленьня людзей зь Нямеччыны ў іншыя краіны. Некаторыя запісы кідаюць крыху сьвятла на абставіны нашага жыцьця й настроі групы. Ува ўсіх выпадках запісваліся параненьні сяброў Дванаццаткі на працы ў шахтах. На шчасьце, вялікіх калецтваў ня было. Апрача гэтага я вёў свой асабісты дзёньнік.

Выпісанае ніжэй – выбар з абодвух дзёньнікаў. Пропускі абазначаныя шматкроп’ем у дужках, а ў простых дужках падаюцца сучасныя паясьненьні.

*1.1.49*

*Атрыманы ліст ад сп. Янкі Юхнаўца. Просіць вярнуць яму сшыткі зь вершамі. Апавяданьне дазваляе папраўляць і зьмясьціць у часапісе.*

*Адбылася чарговая зборка. Дзімітрука ня было. Швайчук прыйшоў аж вечарам, калі ўсе разыходзіліся. Пастанавілі падрыхтаваць праект „ра-*

*мак" на наступную зборку. Чатыры чалавекі маюць выслаць у Нямеччыну па 4 фунты кавы. Пра сьвяткаваньне Калядаў не дамовіліся, бо ня мелі часу – „правінцыялы" сьпяшаліся на аўтобус. Наагул, такое расстрэсенае зборкі, як сёньняшняя, яшчэ ў нас ня было. Дзімітруку пара ўжо паставіць „ультыматум": або-або – так далей быць ня можа. Наступнае „веча" /гэтак мы называлі свае пэрыядычныя зборкі/ мае быць на трэцюю нядзелю – 23 студзеня.*

*2.1.49*

*Цьвірку сяньня 21 год.*

*3.1.49*

*Ліст ад сп. Аляксандра Крыта /пазьнейшы сьвятар і Мітрапаліт Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы; у 1949 г. жыў у Англіі ў гор. Брадфардзе/. Прыслаў 10 шылінгаў на выдавецтва. Хоча сустрэцца, каб абгаварыць супольна справы.*

*Ліст ад сп. Аляксандра Орсы /дырэктар Беларускае гімназіі ймя Янкі Купалы ў Нямеччыне/. Згаджаецца на прапанову адносна Алеся Марговіча /справа выдачы Марговічу, які меў закончаную сярэднюю асьвету яшчэ на Бацькаўчшыне, пасьведчаньня аб заканчэньні гімназіі/. Просіць прыслаць здымкі й пэрсанальныя дадзеныя. (…)*

*Запруднік пайшоў сяньня на працу першы раз пасьля пяці тыдняў – нага паправілася.*

*4.1.49*

*Ліст ад скаўтаў зь Міхэльсдорфу (з подпісам Уладзімера Пелясы). Віншуюць усіх з Калядным сьвятамі.*

*Урбан расьцісnуў палец на левай руцэ. Косьць не пашкоджана.*

*Вострыкаў прыслаў 100 кніжачак цыгарэтнае паперкі /ёю ды іншымі рэчамі мы разьлічваліся за друкаваньне ў Нямеччыне вокладкі часапісу „Наперад!" і прысыланыя нам беларускія выданьні/.*

*5.1.49*

*Ліст ад Буты. Кавы /у Нямеччыну/ выслаць ня можа, бо ня мае грошай.*

*Высланы ліст да сп. Вацлава Пануцэвіча /галоўны шэф беларускіх скаўтаў; жыў у ДыПі лягеры Ватэнштэт у Нямеччыне/ пра разьлік за вокладку для часапісу і атрыманыя календары. Выслана яму 50 кніжачак цыгарэтнае паперкі.*

*6.1.49*

*Зь Лёндану пераслалі віншавальную паштоўку ад сп. Міколы Скабея /грамадзкі дзеяч/ з Аўстраліі.*

*Сяньня й заўтра „шасьцёрка" /сябры Дванаццаткі, што жылі разам у шахцёрскім пасёлку/ не працуе – куцьця й першы дзень Калядаў. Невядома, як рэшта Дванаццаткі.*

*7.1.49*

*Ліст ад сп. Уладыслава Рыжага-Рыскага зь Італіі. Дзякуе за часапісы, віншуе са сьвятамі, перасылае свае тры вершы. Запруднік і Урбан прывезьлі зь Лестэру 15-ты нумар „Наперад" й пачку матрыцаў.*

*10.1.49*

*Ліст ад Алеся Салаўя /з Аўстрыі/. Часапісы атрымаў. Прыслаў два вершы. Высланы ліст Аўгену Кавалеўскаму /актор, пісьменьнік, жыў у Францыі/.Цьвірку раздушыла палец на руцэ. Ці косьць зломаная, невядома. У Урбана палец – окей. Сяньня ўвечары пайшоў на працу.*

*14.1.49*

*Атрыманы 1-ы нумар часапісу „Сіла веры" /выходзіў у Нямеччыне/.*

*18.1.49*

*Атрымалі №21 „Беларуса на Чужыне" /часапіс, выходзіў у Лёндане/, №6 „Моладзі" /часапіс, выходзіў у Парыжы/ і №2(46) „Бацькаўшчыны" /газэта, выходзіла ў Мюнхэне/. У Цьвіркі палец — окей. Папаўдні пайшоў на працу.*

*21.1.49*

*Высланы падпісны ліст ахвяраваньняў на выдавецтва „Наперад!" у Аўстралію на адрас сп. Смаля /былы настаўнік гімназіі імя Я. Купалы/.*

На пачатку году Дванаццатка перажыла свой маленькі крзіс. Паўстала пытаньне належаньня Паўла Дзімітрука да нашай сям'і ў сувязі зь ягоным нерэгулярным прыязджаньнем на зборкі й задоўжанасьцяй сяброўскіх складак. Але справа ўляглася – Паўло падцягнуўся. У дзёньніку пад датай 23 студзеня я запісаў: *„Дванаццатка крызіс перажыла й пачынае здаравець".*

*25.1.49*

*Ліст ад сп. А. Галая. Падае адрасы беларусаў у Даніі.*

*Даведаліся ад сябры-ўкраінца, які паслаў быў пасылку дамоў на Ўкраіну, што пасылка вярнулася з савецкай мытні з укладзенай цыдулкай, на якой было напісана: „Нам такого барахла не нужно".*

*27.1.49*

*Атрымалі ліст ад сп. Уладыслава Рыжага-Рыскага. Дзякуе за палепшаньне вершаў.*

*29.1.49*

*Ліст ад а. Лява Гарошкі /выдавец у Парыжы часапісу „Божым Шляхам"/.Падае весткі адносна стыпэндыяў у Францыі (якіх там няма) і колькі заўвагаў пра „Наперад!".*

*2.2.49*

*Ліст ад сп. В. Грышкевіча /старшыня ЗБВБ/. Піша, што ў наступную нядзелю ў г. Лідсы мае адбыцца сход беларусаў.*

*4.2.49*

*Ліст ад сп. Барыса Рагулі з Бэльгіі адносна ўнівэрсытэту. Канкрэтнага нічога не падае, але прадбачыць магчымасьць атрыманьня стыпэндыяў у наступным акадэмічным годзе. Атрыманы ліст ад сп-ні Варонкі. Піша пра жыцьцё ў Швэцыі. Просіць, калі ёсьць ахвотнік на ліставаньне, падаць ёй адрас. Дасталі пакет канцылярскае паперы ад сп. Галая са Швэцыі.*

*5.2.49*

*Лёня Швайчук перабраўся з Атэрстону ў Ту-Гейтс /сёмы сябра Дванаццаткі/.*

*Жучка й Дзехцяр езьдзілі ў Лестэр па №16 „Напераду”.*

*Урбан і Швайчук паехалі на зборку беларусаў акругі Лідс.*

## „Вератні” – сакрэтная дамова

*13.2.49*

*Адбылася чарговая зборка ў Ковэнтры. Дзімітрука ня было. Гэтая зборка была хіба найбольш сур’ёзная з усіх дасюлешніх. Карась замовіў спэцыяльна залю, а таксама не забыўся накарміць хлебам з сардынкамі й маслам ды напаіць апэльсінавым сокам. Каля пяці гадзінаў „мералі” „вератні*. Бута крыху ярошыўся, аднак супраць усіх цяжка... Што ня ўсьпелі зрабіць, адлажылі да наступнай зборкі, якая мае адбыцца 6 сакавіка, таксама ў Ковэнтры ў тэй жа залі.*

* У сакавіку 1949 г., каб замацаваць наш гурт ды падцягнуць у ім дысцыпліну, мы прынялі для сябе „арганізацыйныя рамкі” — падпісалі свайго роду ўзаемны кантракт, назваўшы яго „Вератнямі”. Што гэта – вератні? Назоў гэты падказаў Васіль Іванавіч, вёска якога, Апечкі – частка коласаўскіх мясьцінаў. І якраз на Якуба Коласа спасылаецца шасьцітомны слоўнік беларускай мовы, тлумачачы варыянт гэтага абласнога слова — „вератнік” (гоні, загон). І там жа прыклад з Коласавага „Сымона-музыкі”: *„Здрасаваў шнуроў тры грэчкі, // Вератнік аўса прыбіў!„* З таго ж лексычнага пласта ў нашых „Вератнях” і слова „склад” (палаcа сьвежай зямлі пры араньні). „Складамі” мы назвалі параграфы ў нашым дакумэнце. Гэтак адлюстраваўся ў ім наш традыцыйны сялянскі сьветагляд. Дарэчы, падобна ў малітве „Магутны Божа” Натальля Арсеньнева карыстаецца тропам зь сялянскага быту, зьвяртаючыся да Бога: „учынкам нашым пашлі ўмалот”.

Поўны тэкст „Вератняў” зьмешчаны ў Х-м разьдзеле кнігі. А тут – асноўнае пра гэты дакумэнт, які заставаўся сакрэтным да апошняга часу.

Спатрэбілася гэтая дамова ў выніку таго, што нам пагражала, так бы сказаць, арганізацыйнае расслабленьне. Жылі мы, як ведама, у чужым асяродзьдзі, раскіданыя, занятыя й пранятыя ў ладнай меры бытавухай, якая цягнула зь неба ідэалаў на зямлю жыцьцёвага камфорту, накідала свае матарыяльныя мэты й вартасьці, адпіхала на задні плян усе тыя высокія мроі, якія нам падказвала наша нацыянальная сьведамасьць, наш ідэалізм. Выходзіла так: з аднаго боку – шахцёрская праца, штодзённыя патрэбы й патэнцыяльныя выгады: кіно, піва, забавы, дзяўчаты, сямейныя інстынкты й падобнае, а з другога – нацыянальная справа: праца над часапісам, грамадзкія абавязкі, палітычная дзейнасьць, міжнацыянальныя кантакты, духовы кліч паняволенай Бацькаўшчыны, жаданьне быць прыкладам іншым аднагодкам.

„Вератні” – якраз люстра ўсіх нашых высакародных грамадзянскіх намераў і лятуценьняў. У гэтым дакумэнце мы гаворым пра пашыраньне і паглыбляньне незалежніцкай ідэялёгіі між суродзічаў; пра патрэбу скіроўваць сілы моладзі на шлях, карысны для нацыянальнае справы; пра неабходнасьць рыхтавацца самім і рыхтаваць іншых да збройнага змаганьня за Незалежнасьць; пра бесьперапынную працу над сабой. Мы выказаліся таксама за поўную падтрымку Рады і Ўраду БНР.

Назваўшы сябе авангардам моладзі на эміграцыі, мы паставілі сабе за мэту быць „прыкладам самаахвярнасьці й адданасьці нацыянальнай справе, быць першымі ўсюды, дзе патрабуюць гэтага інтарэсы Народу” ў імя „сьвятога ідэалу – незалежнасьці Бацькаўшчыны”. Якімі шляхамі мы, абмежаваныя матарыяльна й юрыдычна, зьбіраліся рэалізаваць усё гэта? Бязумоўна, першым такім спосабам павінна была стацца выдавецкая праца. Наш месячнік „Наперад!”, сказалі мы самі сабе ў „Вертанях”, „павінен быць аўтарытэтным голасам і праваднікам усяе нашае моладзі на эміграцыі”.

Каб замацаваць сябе ў гэтай місіі, „Вератні” забавязвалі кожнага з нас выконваць тую працу й заданьні, якія накладзе на яго большасьць Дванаццаткі. Мы таксама задакумэнтавалі тое, што ўжо выконвалі ў моц вуснай дамоўленасьці – плаціць тыднёвы падатак (заработную плату атрымоўвалі штотыдня), каб мець хоць сьціплую, але сталую фінансавую базу. Забавязаліся таксама на выпадак калецтва каторага з нас дзяліць заработак рэшты на дванаццаць частак, каб кожны даставаў пораўну.

Шырэйшае арганізацыі мы тварыць ня зьбіраліся. Дванаццатка радоў не папаўняе, сказалі мы самі сабе. Дагаварыліся таксама, што ў выпадку патрэбы рэагаваць ад імя Дванаццатакі хутка, калі склікаць усіх няма часу, прыймаць пастанову будзе „Трыё” (пэрыядычна перавыбіраныя тры сябры). Устанавілі нават сваё традыцыйнае гадавое сьвята – 8 студзеня – дзень нашага выезду зь Міхэльсдорфу.

Усё гэта мы сказалі толькі самі сабе, не афішуючыся, зазначыўшы ў да-

мове, што яна павінна „трымацца ўсімі сябрамі ў поўным сакрэце” і нават без рабленьня копіяў яе. Я акуртана выкаліграфаваў увесь дакумэнт чырвоным пяром на чатырох старонках вялікага фармату, і мы яго ўсе падпісалі. Была нават дыскусія, ці падпісваць крывёй, але да такой драматызацыі не дайшло. Меліся выпісаць дакумэнт у трох экзэмплярах, але на гэта не здабыліся – быў зроблены толькі адзін. Перахоўваў „Вератні” Цьвірка, які пераслаў іх мне ў лістападзе 1990 г., калі сам ужо быў паважна хворы (гл. ягоны ліст да мяне ў XI-м разьдзеле – „Post Scriptum”).

Зь ліста да Олі Харытончык:

*05.03. 49, Тамўартс*

*Дабрыдзень, Оля!*

*Сяньня ў нас кагадзе пачалася зіма – выпаў сьнег, але такі даволі марнаваценькі, ангельскі. (...)*

*Мы тут гарым надзеяй, што мо ў гэтым годзе (недзе каля ліпеня) удасца папасьці ў Галяндыю ці Бэльгію. Цяпер вось заданьне падрыхтавацца крышку матарыяльна да гэтага – абарахліцца. Ты аднак недзе дрэнна пачула, што, быццам бы, Рагуля казаў, што ў Бэльгіі цяжкія ўмовы для студэнтаў – наадварот, як ён сам піша, у Бэльгіі найбольш адпаведныя з усіх іншых. Аб гэтым самым піша і Занковіч /Анатоль/ Жучку.*

*Праца ў мяне тая самая. Здароўе – дзякаваць Богу. Часу й далей скупа. Некаторыя ў нас ужо рамансаваць пачынаюць. Я йшчэ ўсё адцягваю – мо й бяз гэтага абыдзецца – займацца й так ёсьць чым.*

*Прабую пісаць крыху, але нешта тугавата йдзе – няма настрою. Часапіс і далей патрабуе шмат высілку. Мы думалі былі „падскочыць” на пару тыдняў у Нямеччыну ўлетку, але, здаецца, ня ўдасца, бо не дазваляюць. Грошы таксама патрэбныя. (...)*

*У нас ужо амаль усе парвалі прыватную карэспандэнцыю зь Нямеччынай. Ненармальнага ў гэтым зьявішчы хіба ня шмат, бо звычайна час і адлегласьць робяць сваё.*

*Я сяды-тады перакінуся лістом зь сім-тым з Ангельшчыны ды на гэтым канчаю.*

Зь дзёньнікаў:

*7.3.49*

*Атрымалі: ліст ад сп. М. Панькова і віншаваньні са сьвятам 25 Сакавіка ад Беларускага Нацыянальнага Цэнтру, Беларускай Бібліяграфічнай Службы і Саюзу Беларускіх Журналістых.*

*Атрымалі „зыкзак” 2-гі „Маланкі” /сатырычны часапіс/, „Абвесную грамату ордэну Двупагоні”, „Інструкцыю адносна чарговых выданьняў БННХР” ды №1-2(16-17) „Божым Шляхам”.**

*Высланыя лісты: сп. Антону Адамовічу ў справе крытычнага артыкулу аб „Наперадзе”, ордэну Двупагоні й становішча ў Нямеччыне наагул;*

*др. Аляксандру Орсу ў справе атрыманьня праграмаў для падрыхтоўкі да матуральных экзаменаў.*

* З гэтага нумару „Божым Шляхам" мы даведаліся пра заснаваньне Беларуска-Бэльгійскага камітэту дапамогі беларускім студэнтам ды пра ўмовы й пабольшаныя шансы вучобы там. Часапіс пісаў:

Усе беларускія студэнты ў Бэльгіі, якіх сёньня ёсьць 13, вельмі добра забясьпечаны матэрыяльна і маюць вельмі добрыя ўмовы для студыяў. Ужо маюцца фонды для набыцьця спэцыяльнага дому для беларускіх студэнтаў. Хутка лік нашых студэнтаў у Лювэне павялічыцца.

*8.3.49*

*Віншавальная паштоўка ад сп. Алеся Яцэвіча з Аўстрыі. Просіць скаўцкае літаратуры і нумары „Наперад!" для арганізаваньня скаўцкае адзінкі ў Аўстрыі.*

*Высланыя лісты: у штандар „Франконія" з просьбай дапамагчы арганізавацца беларускім юнаком у Аўстрыі, а сп. Яцэвічу з парадамі што да арганізаваньня новае скаўцкае адзінкі.*

*14.3.49*

*Атрымалі №2(13) „Беларускага Эмігранта" /з Канады/, і „Беларускі Каляндар" з Францыі.*

*16.3.49*

*Матарыял у часапіс ад Ніны Расы. Ліста ніякага не залучыла.*

*Высланы ліст Ніне Расе з просьбай падаць запраўднае прозьвішча, без чаго ня можа быць апублікаваны матарыял, і з прапановай аб сталым супрацоўніцтве.*

*18.3.49*

*Сакавіковыя віншаваньні ад прадстаўніка Рады БНР і беларускай грамады ў Швэцыі, ад рэдактара „Беларуса на Чужыне".*

*Паштоўка ад Алеся Салаўя з Аўстрыі з паведамленьнем, што эмігруе ў Аўстралію.*

*20.3.49*

*Адбыўся 3-ці звычайны гадавы зьезд ЗБВБ. Дзімітрук ня прысутнічаў – быў пасьля хваробы бяз сродкаў. Сябра Бута ня прысутнічаў, нікому нават не перадаўшы ўпаўнаважаньня.*

*22.3.49*

*Атрымалі матарыял у часапіс ад Тодара Мазуры ад імя Беларускіх Багасловаў Пакрова сьв. Міколы ў Рыме.*

kamunikat.org

*23.3.49*

*Ліст ад сп. Барыса Рагулі з просьбай даведацца, ці будуць цяжкасьці з выездам з Ангельшчыны. Таксама пытаецца пра матуральныя пасьведчаньні Марговіча, Урбана й Карася.*

*24.3.49*

*Ліст ад Ніны Расы. Падае сваё сапраўднае прозьвішча /Абрамчык/ і піша крышку пра сябе. Прапануе супрацоўніцтва.*

*25.3.49*

*Атрымалі сакавіковыя віншаваньні ад скаўцкага штандару „Франконія", Янкі Сурвілы й часовае ўправы Згуртаваньня Беларусаў Канады.*

## Скандал! – Бута жэніцца!!!

*27.3.49*

*Адбылася чарговая зборка ў Ковэнтры. Нарэшце сабраліся ўсе 12! Скандал! – Бута жэніцца. Трудна! – Дванаццатака гуляе ў наступную суботу на вясельлі. Шэсьць месяцаў зь Буты карысьці – як з казла малака. Ягоную складку згадзіліся раскласьці па „сікспэнс" /шэсьць пэнаў/ на плячук. Абяцаў, што па шасьці месяцах будзе окей. Цяпер будзе працаваць нібы „тэхнічным рэдактарам" у рэдакцыі „Напераду".*

*Другая „амбараса" зь Дзімітруком. Зьбіраецца ехаць у Нямеччыну (?!) на матуральныя экзамены. Пяць фунтаў даўгу ў касу замарожваецца; далей складкі мае плаціць рэгулярна па 5 шылінгаў і сікспэнс.*

*Выбралі трыё: Шчэцька – 11 галасоў, Запруднік – 11, Цьвірка – 7, Урбан – 5 (не прайшоў). На тры месяцы.*

*На дом для старцаў фунтаў са тры трэба будзе падкінуць.*

*Наступная зборка належалася б 17 красавіка, аднак некалькім хлопцам трэба пад'ехаць на скаўцкі зьлёт, які ладзяць сябры ХАБР-у / Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў*/, каб пазнаёміць тую моладзь з сапраўднаю Дванаццаткай і гэтым сьцерці фальшывае ўяўленьне аб ёй. Зборка адбудзецца недзе пазьней – дагаворымся мо ў Буты. Дык у наступную суботу – на „хаўтуры" /Бутава вясельле/, а там будзе відаць.*

*Арганізацыя апазыцыйная да ЗБВБ, падтрымвала Беларускую Цэнтральную Раду й ейнага прэзыдэнта Радаслава Астоўскага, выдавала ў Лёндане свой часапіс „Аб'еднаньне".

*28.3.49*

*Ліст ад сп. Лявона Хвалька /самы шчодры ахвярадавец „Напераду"/ і фунт ахвяры на часапіс.*

*Містэр Жук /Янка Жучка/ пабіў вялікі палец на правай руцэ. Пакульшто не працуе.*

*29.3.49*

*Сакавіковыя віншаваньні ад Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне і прадстаўніка Рады БНР /Кастуся Мерляка/.*

*Ліст ад сп. Глыбачаніна /Уладыслаў Рыжы/. Прыслаў матарыял у часапіс. Піша крыху аб сабе, прапануе супрацоўніцтва.*

*2.4.49*

*Сяньня дзень жалю – жэнім Буту ці, дакладней кажучы, спраўляем ягоныя „хаўтуры". Жонцы купілі падарунак – касьцюм і блюзачку. Буту – пяць бутэлек джыну й дзьве віна. Наагул уся цырымонія даволі кур'ёзная – мала таго, што жэнім самога Буту, дык яшчэ і ў Вялікі пост. "Усё навыварат", як сказаў адзін сябра з Дванаццаткі. Коратка кажучы, аднаго пахавалі. Хто наступны?*

Бутава жанячка нанесла ўдар па нашай халасьцяцкай маналітнасьці. Пра такі паварот мы ня думалі. У нас некалі была гутарка, што, маўляў, „хлопцы, з чужынкамі ня жэнімся", але ніхто не ўяўляў сабе дакладна, што гэта за сытуацыя, калі чалавек раптам закохваецца ў чужынцы. Праўда, кожнаму з нас пачуцьцё каханьня было добра ведамым. Пра гэта красамоўна сьведчылі нашыя творы ў „Наперадзе". Хоць Бута мог быць і выняткам. Ад самага пачатку знаёмства зь ім у 1946 г. ня выглядала, каб ён цікавіўся рамансамі. Ён бегаў нагэтулькі заняты скаўтынгам і друкарскай справай, што, як выглядала, яму было не да дзяўчат. А тут раптам да яго заўсьміхалася мілавідненькая бляндыначка. „Во, яна мне падарыла запальнічку", казаў ён дрыжачым голасам і паказваў свой найкаштоўнейшы падарунак. Ня выключана, што было гэта ў ягоным 28-гадовым веку першае каханьне – і таму такое моцнае. Так што, калі мы й успрынялі ягонае жанімства як бяду, дык усяроўна ведалі, што сябру ў бядзе не пакідаюць. А таму справілі яму вясельле. На даўгаватым замурзаным стале пад нейкім навесам расставілі прывезеныя з сабой кансэрвы й бутэлькі, зрабілі лавы, паклаўшы на пустакі дошкі, ды адсядзелі на іх зь ня надта вясёлымі мінамі, папіваючы джын ды закусваючы сардынкамі. Бацькоў маладой за сталом ня было. Бута браў жонку з боем. Прымірэньне зь цясьцямі настала пазьней.

Наступных жанячак у нас да ад'езду ў Бэльгію ня было. Але пасьля некаторым выпала ажаніцца ўсё ж з чужынкай – італьянкай, немкай, бэльгійкай. Як каму. Але пра гэта ўжо ў „Эпілёгу".

*10.4.49*

*Першая зборка Трыё. Абмяркоўвалі дачыненьні Дванаццаткі да БННХР, да новае Галоўнае скаўцкае кватэры ды праектаванае сп. Вацлавам Пануцэвічам арганізацыі моладзі. Устанавілі бюджэт, тыраж „Наперад!" /300 экзэмпляраў/ і справу выдавецтва ў Нямеччыне.*

Зь ліста да Олі Харытончык:

*12.04.1949*

*Дабрыдзень, Вольга!*

*(…) Нядаўна быў у Лёндане на 3-ім зьезьдзе ЗБВБ. Ты знаеш, у Лёндане цяпер адкрытыя ізноў пасьля вайны ўсе рэклямы. Уначы Лёндан – гэта цэлы фэервэрк. Пару нядзель пасьля Лёндану жанілі... самага паважанага спадара Буту Аляксандра (!!!). Ня дзівіся – у жыцьці бывае ўсё. Жоначка ягоная – маладое ангельскае дзяўчо і з мордачкай нат нічога сабе. Бута там ля іх недзе жыў на прыватцы. Пазнаёміўся зь ёю, зьнюхаўся, ну, і ўхлопаўся, тым больш, што ангелькі рахманыя і хлапцамі надта не перабіраюць. Адным словам – вечная памяць рабу Божаму Буту. Хай яму лёгкім будзе ангельскае жыцьцё. Амінь.*

*Ну, а акрамя Буты, здаецца, усё ў парадку. Ніхто ня жэніцца й ніхто нат не „кахаецца", ня ўлічваючы дробных любоўных афэраў. (...) Чакаем на ліпень, які мае разьвязаць на гэты год наша пытаньне адносна Бэльгіі. Зразумелая рэч, да Бэльгіі трэба падрыхтавацца добра матарыяльна. Калі з Бэльгіяй нічога ня выйдзе, пад'едзецца ў Нямеччыну да старых знаёмых. (...) Кантракту мы ніякага не падпісвалі другі раз. Я думаю, калі б нам удалося дастаць дазвол на ўезд у Бэльгію, дык выехаць адсюль ня было б ніякіх цяжкасьцяў. У нас тут вясны пакуль што яшчэ ня відаць, хаця я так даўно яе чакаю. Вольны час і далей прабягае ў клопатах ля часапісу, у чытаньні, пісаньні ды хаджэньні ў кіно – гэта пакуль і ўсё. (...)*

*У нас тут, на жаль, ні сасоньніку, ні ельніку няма. А з ахвотай цяпер пабадзяўся б па лесе! Чым бліжэй адчуваеш вясну, тым вастрэй уразаюцца ў думкі, асабліва вечарамі, і гэтыя ельнікі з сасоньнікамі й іншае, і іншае... Як той казаў, і кудысьці цягне і чагосьці хочацца. Проста неяк аж страх бярэ перад навалай думак і пачуцьцяў, якую адчуваеш з прыходам вясны.*

*Адно збаўленьне ад гэтага — гэта вось такая бястурботна-шалапутная кампанія, як Дванаццатка. Адчуваю, што безь яе было б крута.*

Зь дзёньнікаў:

*16.4.49*

*Зьезд БННХР. У Лёндан прыяжджае Прэзыдэнт Мікола Абрамчык.*

*Цьвірка й Урбан паехалі як дэлегаты ад Дванаццаткі на зьезд БННХР.*

*19.4.49*

*Ліст ад сп. Станіслава Грынкевіча /доктар мэдыцыны, жыў у Нямеччыне/. Абяцае прыслаць матарыял для часапісу.*

Зь ліста да Олі Харытончык:

*29.04.1949*

*Добры вечар, Оля!*

*Вечар, праўду кажучы, ня зусім і добры: дождж, нешта восеньскае. У*

*нас тут наагул пагоды добрае ня было, хіба толькі пару дзяянькоў. Ну, але яшчэ sunshine /сонца/ наперадзе. (...)*

*Наагул я цяпер адчуваюся даволі ўраўнаважана, асабліва, калі справа нашае далейшае навукі стала крышку больш надзейнай. Нядаўна быў у Лёндане, пасьля – у Лідсы, а пасьля заяжджаў і да нас сп. Прэзыдэнт / Старшыня Рады БНР Мікола Абрамчык/. Мы зь ім правялі каля чатырох гадзінаў. Акрамя гэтага, я езьдзіў суправаджаць яго зь Лідсу да нас і гутарыў зь ім усю дарогу. Шмат цікавых рэчаў, шмат пацяшаючай інфармацыі даведаліся мы ад яго. Чалавек пачынае быць больш аптымістычным і верыць, што ўсё будзе окей.*

Зь дзёньнікаў:

*1.5.49*

*Адбылася зборка. Апрача Васіля, якому нешта непаздаровілася, былі ўсе. Бута, зразумела, прыехаў з жонкай. Падпісалі „Вератні", але толькі адзін экзэмпляр. У Трыё заміж Цьвіркі ўвайшоў Швайчук. Патрэбныя грошы, грошы, грошы!.. Наступная зборка 22 травеня ў Буты.*

## Мы наперадзе 30-ці кандыдатаў

Зь ліста да Олі Харытончык:

*05.05.1949*

*Добры вечар, Ольга!*

*(…) Рагуля нядаўна прыслаў ліст. Піша, што 12 месцаў яны маюць і што мы наперадзе з 30-ці кандыдатаў. Трэба зараз будзе пачынаць фармальнасьці з выездам. Сп. Прэзыдэнт, будучы ў нас, казаў, што можа ўдасца выехаць усёй Дванаццаткай. Хто ня мае матуры – пойдзе ў інстытут. Даў бы Бог! (...)*

*У нас тут працы грамадзкае прыбаўляецца з кажным днём. Цяпер яшчэ ў дабавак да ўсяго БННХР наваліўся. З часапісам спазьніліся, але хутка нагонім.*

*А рэшта — усё пастарому. Настрой наагул нядрэнны. Шмат паддае бадзёрасьці надзея на хуткую вучобу.*

Зь дзёньнікаў:

*22.5.49*

*Адбылася чарговая зборка ў Стокінгфордзе ў сябры Буты. Пастанавілі давесьці да парадку касу й часапіс да 1 ліпеня 1949. Карэспандэнцыю разлажылі на трох чалавек. Наагул, пара ўжо вылізацца зь „вяліцы" ды брацца за сыстэматычную штодзённую працу.*

*Наступная зборка мае быць у Тамўартсы для ўсіх беларусаў, што жывуць у гэтай ваколіцы. 4-га чэрвеня паедзем у Брадфард, дзе заадно зь вечарынай трэба будзе падрыхтаваць грунт для БННХР.*

*Дзімітрук паабяцаў да 17-га ўпарадкаваць задоўжанасьць у касу. Швайчук таксама даў слова ўсё ўладзіць.*

*У Тамўартсы, Ковэнтры і Нанітане разьведаць у Labour Exchange наконт атрыманьня дакумэнтаў у Бэльгію. (…) У Бэльгію чамусьці надта ня верыцца – мо таму, што гэта вялізарнай важнасьці для нас і таму здаецца недасяжным. За гэты час прывык да ўсяго.*

*26.5.49*

*Атрымалі „Дэкрэт” Канцылярыі БНР аб нацыянальным ападаткаваньні й 10 штук заяваў у ЗБВБ. Піліп /Дзехяр/ пабіў палец на левай руцэ.*

*10.6.49*

*Ліст ад сп. Браніслава Даніловіча й чатыры крыжаслоўі для часапісу.*

*18.6.49*

*Цьвірка й Запруднік паехалі ў Лёндан на паседжаньне кіраўнічага цэнтру БННХР.*

*2.7.49*

*Урбан і Запруднік езьдзілі па 19-ты нумар часапісу. Атрымалі заказным ад сп. Будзькі другую частку „Яцьвягаў”, ліст ад Ант. Адамовіча й 1-ы нумар „Праца і воля” – орган БНП /Беларуская Незалежніцкая Партыя/.*

*3.7.49*

*Адбылася чарговая зборка ў Ковэнтры. Ня было Дзімітрука. Прайшла наагул сур'ёзна й дзелавіта. Наступная зборка мае быць яшчэ больш удасканальненa. Пастанавілі рэарганізаваць зборкі, каб менш часу траціць на рэчы менш важныя, а ўвесьці рэфэрацікі ці дыскусіі, якія б выраблялі сяброў і пашыралі іхны далягляд у пытаньнях грамадзка-палітычных. Трыё зацьвердзілі тое самае на далейшыя тры месяцы. Трыё мусіць весьці пратаколы сваіх паседжаньняў.*

*Наступная зборка 24.7.49 у Нанітане, дзе Бута мае папрасіць у скаўтаў залі.*

*24.7.49*

*Адбылася зборка ў Нанітане ў скаўцкім бараку, на які дагаварыўся с. Бута. Вострыкаў спазьніўся, прыйшоў пад самы канец. Між іншага, абгаворвалі справу Дзімітрука і пераводу яго ў Ту-Гейтс. Наступная зборка тамсама 14.8.49.*

*26.7.49*

*Атрымалі ад сп. Пануцэвіча вокладкі трох наступных нумароў „Напераду” і 10 экзэмпляраў „Падарожжа Гулівэра да Волатаў” (па-беларуску).*

*14.8.49*

*Зборка адбылася. Сабраліся ўсе – Нанітан якраз добрае месца. Добра, што Бута апароў гэныя баракі – са скаўтамі заўсёды дамовіцца можна.*

*Зборка прайшла добра, дагаварыліся, як кажуць, па ўсіх пунктах. Шчэцька расказаў пра свой рэфэрат у Брадфардзе. Рэфэрат наступны падрыхтуе Бута – возьме часы ад Напалеона да 1905 году. Карасёў рэфэрат прышлося адлажыць – без матарыялу нічога ж не падрыхтуеш, тым больш „Значэньне палітычных арганізацыяў". (…)*

*Вечар сяньня запраўды летні. Хадзілі ў кіно, пасьля – на пару шклянак піва. Гадзін дзьве прахадзіў зь Дзімам па Тамўартсы, а пасьля пехатой прыйшлі ў гостэль. Гутаркі кружацца ўсе вакол Бэльгіі. Як будзе, калі паедзем? Што станецца, калі не? Хутчэй бы разладаваць гэты акумулятар напружанага чаканьня! Ня ведаю, я дык не магу ўявіць сябе на ўнівэрсытэце. Мо гэта таму, што столькі значэньня прыдаеш усяму гэтаму.*

Выбухалі часамі спрэчкі наконт рэалістычнасьці нашых спадзяваньняў на ўнівэрсытэт.

*15.8.49*

*Толькі што зрэзаўся з Жукам і Паўлом пра прыватнкі. Значыць, па-іхнаму, з Бэльгіі нічога ня выйдзе. Трэба будзе, кажуць, браць карэспандэнцыйны курс. У гостэлі вучыцца нельга будзе – перашкаджацьмуць, да злосьці даводзіць; у чытальні зімой поўна народу, не адпачнеш душой… Да гэтага недасыпаньне ды недаяданьне. Трэба йсьці на прыватку. Знайсьці файную такую…. І браць карэспандэнцыйны курс…*

*А часапіс? А ўся праца?.. Што з гэтым?.. Дык гэта рана ці позна прыдзецца кінуць. Ня будзеш жа да сьмерці сядзець у гостэлі й рабіць. Трэба аб сабе таксама падумаць. Ужо яму 25 гадоў… А сваю частку, што ён цяпер робіць, дык ён і на прыватцы жывучы ад яе не адмовіцца.*

*Я ўжо ўяўляю сабе, як будзе выглядаць часапіс, калі распаўзуцца ўсе па сваіх прыватках. (…) А ўсё дзеля таго, што з Бэльгіі нічога ня чуваць. Пачынаецца ўжо „пераладаваньне"…*

*21.8.49*

*Сяньня былі ў Ковэнтры. Паехалі ўчора вечарам: я Дзіма й Жук. Васіля й Карася, зразумела, дома не засталі. Улезьлі цераз вакно. Па гадзіне 12-й прыцягнуліся й яны.*

*Сяньня а 11-ай гадзіне пайшлі на першую беларускую багаслужбу ў нашай акрузе. Сьвятар сустрэў нас з працягнутай рукой – думаў ужо, што й не дачакаецца нікога. На службе было чалавек зь дзесяць. Пяяць ня было каму, дык пялі самі – выйшла нат нязгорш. На канец запялі „Магутны Божа". Атрымалася зусім добра. Царква там вялікая й малітва гучэла запраўды цудоўна. Айцец быў узрушаны.*

*Пасьля пайшлі да сп. Сакалоўскага на кватэру й абгаварылі справу залажэньня свайго собскага прыходу. Павінна хіба што ўсё пайсьці добра. Праўда, падчас службы быў успомнены архіепіскап Сава /галава*

*Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы/, але таксама й епіскап Сергій, які ўзначальвае пакуль што Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву. Запрапанавалі айцу ўспамінаць у часе службы таксама й Беларускі Народ і сьвятую Еўфрасіньню Полацкую.*

*Сьвятар наагул падыходзіць да справы вельмі шчыра й трэба думаць, што пры нашай актыўнай падтрымцы прыход будзе заложаны й будзе праводзіцца вельмі карысная нацыянальная справа.*

*У сваёй пропаведзі айцец зазначыў, што мусім вярнуцца на Бацькаўшчыну з усім здабытым дасьведчаньнем і будаваць Вольную Беларусь.*

*24.8.49*

*Рагуля падкінуў ізоў надзеі на Бэльгію. У пачатку наступнага месяца павінен быць канкрэтны адказ. Айцец Гарошка выстараўся нібы шэсьць стыпэндыяў у Гішпаніі, але Рагуля туды ехаць ня раіць – узровень ніжэйшы ды, акрамя гэтага, трэба тварыць моцны цэнтар у Лювэне.* Напісаў сяньня ў IРО /міжнародная арганізацыя дапамогі/ ў справе матарыяльнай дапамогі – можа што-небудзь і выйдзе. (…) Гэты тыдзень раблю шэсьць шыхтаў: уся праблема цяпер – гэта як найбольш зарабіць да выезду на навуку.

*28.8.49*

*Адбылася першая беларуская багаслужба ў Ковэнтры. Прысутных было чалавек з 12, аднак службу адсьпявалі даволі добра. Апрача ковэнтраўскіх, на службе былі Цьвірка, Жучка, Запруднік. Пасьля службы адбылося паседжаньне й заснаваньне парафіі. Выбралі царкоўнага старасту й пастанавілі знайсьці сьвятару кватэру. Са сьвятаром гаварылі адносна неўспамінаньня Савы. З часам зробіцца. Трэба думаць пра заснаваньне царкоўнагна хору.*

*29.8.49*

*Рагуля яшчэ аднаго ліста прыслаў. З Гішпаніяй у нас нічога ня можа быць, бо там прыймаюць на стыпэндыі толькі каталікоў.*

*У „Баявую Ўскалось” трэба было б што-небудзь напісаць – маю ўсяго тыдзень часу. Прыдзецца каторага дня садзіцца за вершы. А так неахвота: трэба ангельскую вучыць, французскую зубрыць, у свой часапіс сёетое даць і г. д., і г. д.*

*Калі застанемся тут на зіму (ня дай Божа!), дык думаю пашукаць настаўніка ангельскае мовы і можа… танцаў. Зрэшты, будзе відаць.*

*3.9.49*

*Вечарына ў Лёндане. Езьдзілі Цьвірка й Запруднік.*

*4.9.49*

*Другі зьезд БАХА /Беларускае Акадэміцка-Хрысьціянскае Аб’еднаньне/ „Жыцьцё”. Езьдзілі Цьвірка й Запруднік.*

## У Лёндане

*11.9.49*

У пазамінулую сыботу я зь Дзімам паехалі ў Лёндан. У сыботу вечарам мела быць першая беларуская вечарына, ладжаная лёнданскім аддзелам ЗБВБ, а назаўтра – другі агульны звычайны гадавы зьезд БХАА „Жыцьцё". Нехта з нас мусіў ехаць (прасілі абавязкава ўсіх, але дзе там!). З грашыма ў хлапцоў наагул слабавата, дык акрамя нас двух і ехаць ніхто не захацеў. У Дзімы з грашыма найгорш, дык мо возьме сабе за дарогу з касы /„Напераду"/.

*Вечарына была файная. Мы крыху спазьніліся: езьдзілі да Лашука /Аляксандра/ на падвячорак, але патанцаваць яшчэ ўсьпеў. (…)*

*Нашыя прабавалі пяяць крыху, але, не падрыхтаваўшыся, выходзіла ў іх слаба. Я, зрэшты, выйшаў, каб і ня слухаць.*

*Аркестра была ўкраінская. Гралі танцы кантынэнтальныя – і нічога сабе нат.*

*Нейкі скаўт-паляк прабаваў гаварыць з намі наконт наладжаньня супрацоўніцтва між скаўтамі з-за „зялезнай заслоны" (памяняліся нат адрасамі), але ня ведаю, ці ў нас з гэтага што-небудзь выйдзе.*

*На вечарыне было даволі людна – чалавек каля двухсот.*

*Палавіна дванаццатай, апошнім цягнікам падземнай чыгункі, зь песьнямі (ня зусім удалымі), зь мяхом „кейксаў", з выкрыкамі „Лёндан наш" (некаторыя былі крыху падвыпіўшы), вярталіся ў Беларускі Дом.*

*Назаўтра быў зьезд „Жыцьця" ў доме айца Сіповіча. Прайшоў звычайна, калі ня лічыць інцыдэнту зь сябрам Аморам і ягоным бязбожніцтвам, ці як сказаць. Справу гэтую падняў Надсон у выглядзе агульна прынцыповым. Амор прыняў гэта адразу на сябе, а старшыня Грышкевіч ня змог утрымаць дыскусіі ў агульных рамках. Выйшла тое, што Амор „вялікадушна" заявіў, што ён можа выступіць, каб пазбавіць арганізацыю няпрыемнасьцяў.*

*Дзіма, як дэлегат, паедзе ў Бэльгію на зьезд ЦБСА /Цэнтраля Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў/. Дарогу мае аплаціць „Жыцьцё", але ня ведаю, як гэта яму ўдасца.*

*У айца /Сіповіча/ акапаў два беларуска-маскоўскія слоўнічкі. Хоць пад расьпіску, але ўсё ж вымаліў іх на два тыдні.*

*Уначы, ужо ў панядзелак, стоячы ўсю дарогу ў калідоры, дабраліся цягнікам „дамоў".*

*У сераду прыйшло сала й каўбаса, што Алесь выпісаў зь Лёндану. Надзвычайная ідэя! За 7 шылінгаў два фунты сала заўсёды можна сабе дазволіць.Пагода стаіць цяпер надзвычайная. Пахне крыху восеняй. Як заўсёды, на гэткіх пераломах пораў году перажываеш больш, чым калі-небудзь.*

*А наагул заўважаецца, што пакрыху пачынаеш улякоўвацца ў сучасных абставінах. Што будзе за пару гадоў, калі так…?!*

На пачатку верасьня 1949 г. ў Лёндане адбыўся 2-гі агульны зьезд Бе-

ларускага Хрысьціянскага Акадэміцкага Аб’еднаньня „Жыцьцё”. На зьезьдзе выбралі трох дэлегатаў ад БХАА на трэці зьезд Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Чужыне ў гор. Лювэне ў Бэльгіі. („Беларусь на Чужыне” № 14, 17 верасьня 1949) Уладзімер Цьвірка быў адным з трох дэлегатаў. Тады ж у Лёндан прыехаў з Бэльгіі Барыс Рагуля, зь якім мы пабачыліся. Надзея на Лювэн ізноў шуганула ўгару.

*14.9.49*

*У нядзелю ўсе бачыліся /у Ковэнтры/ з Рагулем. Вынікі гутаркі: кажны староўча рыхтуецца да выезду ў Бэльгію. Найцяжэйшае пытаньне цяпер – грошы. Як падумаеш, дык і тое трэба, і тое трэба…*

*Багаслужба ў нядзелю была нікудышная. Сьпяваць ня было каму, а да гэтага йшчэ тон быў такі страшны, што ніяк хапіць нельга было. Добра, што прыехалі пазнавата, дык служба была скарочаная – неяк адмармыталі. Слоў ня ведае ніхто, мэлёдыі таксама. Шчэцька падказвае: „Табе Госпадзі”, а сьвятар – „Памілуй Госпадзі”, а ў нас наагул толькі „Госпадзі” чуваць. З Савам гэным нешта рабіць трэба. Як пачуеш, дык толькі грэх у сьвятым месцы наганяе.*

*Кватэры айцу яшчэ не знайшлі. Справа заснаваньня парафіі выглядае наагул бледнавата. Сяньня прыйшло сала. Наагул перакуска гэткая – ідэя зусім нядрэнная: лепш зьесьці тыя шылінгі, чым на піве прапіць.*

*Які факультэт выбраць? Эканомію? Мусіць так і прыдзецца зрабіць, бо гэта найбольш неабходная рэч на выпадак здабыцьця Незалежнасьці. Трэба будзе Кіпелю напісаць – што яму мэдыцына ўздумалася? У „Баявую Ўскалось” хоць зарэжся, а пішы.*

*22.9.49*

*Балазе адваліў пару вершаў у „Баявую Ўскалось” – на некалькі тыдняў будзе супакой.*

*26.9.49*

*Увечар, як заўсёды – кіно й пара пайнтаў піва. Швайчук зь Піліпам прывезьлі часапіс. З „ачком” скандал. Уселіся ўжо былі на цэлую ноч. Угаворы не памагаюць. Павыкручваў лямпачкі, дык недзе з умывальні прынесьлі. Паабяцалі граць да трэцяе. У тры скончылі. На наступнай зборцы трэба будзе адштурцаваць гэтую „двойку”. (…)*

*Сала ёсьць, хоць расьперажася. Есца колькі можа ўлезьці. (…)*

*2.10.49*

*Адбылася чарговая зборка ў Арлеі ў Буты. Вострыкаў, зразумела, прыйшоў самы апошні. На Карася із Шчэцькам чакалі таксама.*

*Першым пунктам дня было карцёжніцтва. Гульню на грошы забаранілі. Да наступнай зборкі пастанавілі падрыхтаваць праект эмблемы Дванаццаткі /намер не рэалізаваўся/. (…)*

*Да наступнай зборкі Вострыкаў мае падрыхтаваць рэфэрат на гістарычную тэму.*

*5.10.49*

*У нядзелю зборка. У Буты. Хатка ягоная самая звычайная. Зь цясьцямі паміраыўся. Залатыя пярсьцёнкі маем сабе справіць. На наступнай зборцы – конкурс праектаў /ня зьдзейсьніўся/. З рэфэратамі туга йдзе й вяла. Наагул, заядае нас гэтая канкрэтная прапагандавая акцыя. Адзін Вострыкаў хіба толькі баявейшы ў гэтым. (…)*

*9.10.49*

*За ноты ўзяўся заядла. Спадзяюся ўсё ж на гэты раз выцягнуць да канца. Ад крыку ў бараку аж праціўна робіцца. Добра, што хоць на пару гадзінаў пазбыўся ўсіх – у кіно паперліся. Трэба канчаць кніжку Дастаеўскага; чытаю «Кроткую».*

*11.10.49*

*Цэлы тыдзень за акардыён брацца нельга, бо двух чалавек на начной шыхце. Мадзяр прабаваў учора скандал рабіць. Адчуваю, што ноты даюцца ня цяжка. Часу толькі. (…)*

*Як толькі высьвятліцца справа з Бэльгіяй адмоўна, віхрам пачнуцца калядныя плянаваньні.*

*13.10.49*

*На папярэдняй зборцы 12-кі:*

*Шчэцька: «Вось, калі Карась хоча выказаць нейкую думку, дык ён скажа ў дзесяць разоў больш слоў, чым трэба.»*

*Карась (спакойна): «Гэта таму, што ў мяне слоўнік багаты…»*

*А сяньня: Ня гледзячы на тое, што традыцыі «Галоднай брацii» пакрыліся жырам сытасьці, час ад часу старое прыпамінаецца. Алесь, чытаючы газэту, раптам згледзеў, што ўжо палавіна першае. Схапіў кубак, лыжку, відэлец, нож і пратадзіяканскім басам: «Бра-а-а-ці-і-і-я!..» і павольна (ён у нас «паважны») высунуўся з хаты.*

*15.10.49*

*Уначы Цьвірка паехаў у Лёндан, каб адтуль падацца ў Бэльгію на зьезд ЦБСА. (…) У кіно не хадзіў. Налягаю на ноты й кніжкі наагул. Прачытаў «Воля й посьпех» О. Мардэна. Кніжка надзвычай карысная як маладому, так і старому. Застаўляе задумоўвацца шмат-шмат над чым. Хоць бы гэткае: «Чалавек, пазбаўлены весялосьці, падобны да возу бяз рысораў: хто ў ім едзе – наражаны на няпрыемнае трасеньне праз цэлае жыцьцё». Гэтая кніжка – жыцьцёвы лемантар, падручнік і энцыкляпэдыя. Надзвычайная!*

*25.10.49*

*Атрымалі ад М. Панькова „Пад такім знакам” (гістарычная канцэпцыя Двупагоні).*

*28.10.49*

*У бараку, як на полюсе: гадзін са тры пайграў на акардыёне, дык акалеў проста. Зіма ў гэтым годзе будзе мусіць вастрэйшая за такрочную.*

*Багдана /сябра-украінец/ сяньня прывялі дамоў на аднэй назе – папаў пад камень, бядота. Чытаю «Село Степанчиково и его обитатели» /Дастаеўскага/: «Низкая душа, выйдя изпод гнёта, сама гнетёт». Як трапна!*

*30.10.49*

*Адбылася чарговая зборка. Абгаворвалі справы выезду ў Бэльгію, часапісу „Наперад!" і інш. Сябра Бута ў наступную сыботу мае прачытаць у Брадфардзе рэфэрат аб Слуцкім паўстаньні.*

*30.10.49*

*Учора прыехаў Цьвірка /са зьезду ЦБСА/.* Стопрацэнтовага ізноў нічога, аднак трэба лічыцца з магчымасьцямі, што за месяц-два можам быць там. За дзьве нядзелі павінен быць канкрэтны адказ адносна стыпэндыяў. Пабачым…*

*Зьезд Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў адбыўся ў Лювэне 16-22 кастрычніка. На ім прамаўляў наш будучы апякун і мэнтар а. Робэрт ван Каўэлярт, старшыня бэльгійскага Камітэту дапамогі беларускім студэнтам. У сваёй прамове ён „асаблівую ўвагу зьвярнуў на ролю й абавязкі студэнта наагул, а ў асаблівасьці на тып студэнта-беларуса – змагара за вольную й незалежную Беларусь". На зьезьдзе быў зьменены назоў ЦБСА на ЦБАА – Цэнтраля Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў. Старшынём ЦБАА застаўся Барыс Рагуля. Цьвірка быў абраны за аднаго з трох рэфэрэнтаў. („Беларус на Чужыне" №16, 25 лістапада 1949)

Зь дзёньніка:

*1.11.49*

*Гэты тыдзень папрабую спаць 5—5,5 гадзінаў. Цікава, як гэта выглядацьме. Усё ж за сем гадзінаў /вольнага часу/ на дзённай шыхце можна больш зрабіць, чым за чатыры на паабедзеннай. Трэба мусіць брацца за францускую…*

*3.11.49*

*З нотамі пасоўваюся наперад.*

*Пазычыў нямецкую кніжку „Леанарда да Вінчы" Дзімітрыя Меражкоўскага". Бачынак 20-40 трэба чытаць штодня, бо нямецкая пачынае забывацца. Французская йдзе туга, бо няма яшчэ канкрэтнага з Бэльгіі. За пару дзён павінна высьвятліцца.*

*6.11.49*

*Езьдзіў у Ковэнтры на паседжаньне акруговай управы /ЗБВБ/. За два тыдні мае адбыцца гадавы зьезд акругі. На днях павінен быць адказ адное-*

*на нашых стыпэндыяў. Калі мы выедзем, дык тут усё заглохне, хоць і дасюль ледзь-ледзь ліпела. Людзі заціхаюць, заседжваюцца, жэняцца – чужое жыцьцё, як балота, зацягвае ў свае нетры аднаго за другім. Хутчэй бы выбрацца адсюль, каб не глядзець на ўсё гэта. Калі застанемся тут, дык акрамя часапісу ды аднаго рэфэрату ў месяц больш нічога ня зробім.*

*У кіно сяньня не пайшоў. Пастанавіў хадзіць на фільмы гістарычныя, зь якіх можна нешта вынесьці. Рэшта ж іх – гэта прыемнасьць на дзьве гадзіны і ўсё. Час гэты можна выкарыстаць на нешта іншае, карысьнейшае.*

## На даляглядзе – Бэльгія!!!

*13.11.49*

*На гэтым тыдні тэлеграма: у Бэльгіі атрымана 42 стыпэндыі. Уф! Нарэшце! Колькі чаканьня, перадумоўваньня й нецярплівасьці. Шахта, good-bye! Аж ня верыцца. Гарачкава пачынаем рыхтавацца. Хоць айцец Сіповіч пісаў, што пэўнасьці на стыпэндыі — 99%, аднак хіба што соты працэнт не падвядзе нас. Учора купіў сабе пальто. Купіцца яшчэ сёе-тое з барахелца дый добра будзе. Дзіме трэба памагчы крыху. (…) З выбарам факультэту – задача. Пайду мусіць на практычную эканомію.*

*20.11. 49*

*Учора прыехалі спсп. Лашук /Аляксандар/ і Будзька /Часлаў/. Вечарам асушылі дзьве бутэлькі джыну й дзьве шэры. Дакончваць хадзілі ўжо ў бар. Будзька быццам бы мае ехаць у Нямеччыну, каб адгэнуль з бацькамі пераехаць у ЗША.*

*Сяньня ў Ковэнтры адбыўся малебен, а пасьля – гадавы зьезд акруговага аддзелу /ЗБВБ/. Сытуацыя пасьля нашага ад'езду зьменіцца. Будкевіч і далей старшынёй. Мне прыйшлося старшыняваць на зьезьдзе. Было колькі новых зь Бірмінгаму. Карніловічу /Сяргею/, здаецца, знайшлі дваюраднага брата. Будзька начуе ў нас. Хлопцы ў кіно. Я чытаю.*

*Хутчэй бы ў Бэльгію!*

*25.11.49*

*Ад а. Сіповіча атрымалі сяньня ліст, у якім ён непакоіцца, што з Бэльгіі яшчэ няма нічога канкрэтнага адносна нашых стыпэндыяў. У хлопцаў надзея йзноў пачынае зьнікаць. Чаканьне гэтае страшэнна мучыць! Няўжо ўсё праваліцца?! Прынамсі на гэтую зіму. Праз увесь гэты час чаканьня я стараюся трымацца на дзьвюх палавінах. Пляны падрыхтоўваю на абедзьве эвэнтуальнасьці.*

*Паўлюк сяньня сваёй „філязофіяй" навёў на думку падрыхтаваць пару рэфэратаў на наступныя зборкі Дванаццаткі. Трэба будзе папрабаваць. Першы быў бы нешта: „Штадзённая філязофія" ці падобнае, а другі – „Аб характары".*

*Французскае мовы ў абодвух выпадках пастараюся ня кідаць.*

*5.12.49*

*Пару дзён таму дасталі ліст з Бэльгіі: стыпэндыі атрыманыя; сьпісы паданыя на зацьверджаньне дазволу на ўезд; калі будзе вынік – невядома; магчыма, працягнецца й зь месяц. Трэба купляць пасьцельнае хусьцё ад падушкі да коўдры. У капальні прыдзецца мусіць даць бястэрміновы „нотыс” /заяву аб сканчэньні працы/.*

*У сыботу прыяжджаў а. Тарыновіч. Учора ў чытальні адслужыў для нас абедню. Акрамя нас /жыхароў гостэлю/, былі Вострыкаў і адзін украінец, якога і не прасілі, бо баяліся, што можа выйсьці няпрыемна з Савай / з успамінаньнем архіепіскапа Савы ў часе багаслужбы/. Айцец аднак Савы не ўспамінаў. На наступны раз можна будзе й украінцаў запрасіць.*

*Учора была зборка Дванаццаткі. Буты ня было – жонка перад родамі. У Галіфакс на маніфэстацыю АБН /Антыбальшавіцкі Блёк Народаў/ прыдзецца ехаць мне. Вось прамову трэ неяк на ангельскую пералажыць.*

*Із Швайчуком і Піліпам цэлая „гісторыя”. Апошнімі часамі йзноў пачынаюць дні й ночы праседжваць за картамі. Справу паставілі войстра – можа дайсьці да выключэньня з Дванаццаткі.*

*Пастановаў ніякіх ня было (усё рабілася насьпех зь недахопу часу). З Швайчуком гаварыць страшэнна цяжка, аднак учарашняя зборка змусіць іх абодвух задумацца сур’ёзна. Пабачым, што будзе далей.*

*13.12.49*

*Пазаўчора быў у Галіфаксе на маніфэстацыі. Прайшло ўсё надзвычайна. Беларускі сьцяг, транспарант і калёна, чалавек 70 /беларусаў/ бяз*



ф4-1 (29)

*Беларуская калёна на чале антыкамуністычнай дэманстрацыі ў Галіфаксе. Сьнежань 1949 г.*

*розьніцы на групы /палітычныя/, ішлі наперадзе двухтысячнай масы: беларусы, літоўцы, украінцы. Прамова мая атрымалася зусім добра, хоць падрыхтаваны быў не занадта. Наступнае заданьне – гэта адсьвяткаваць Каляды – разам таксама, бяз розьніцы на групы.*

На каталіцкія (ці, правільней, англіканскія) Каляды мой сябра па працы Д'ік Сміт, старэйшы ўжо дзядзька, запрасіў мяне да сябе ў сям'ю за сьвяточны стол. Даручылі мне нават ганаровую функцыю – сказаць малітыву, якую тут жа падказалі. Запамятаць яе было ня цяжка – адзін сказ: Dear Lord, we are extremely grateful for what we are about to receive /Госпадзе, мы вельмі ўдзячныя за тое, што зараз атрымаем/. Гэты жэст сябры-супрацоўніка прыпаў мне вельмі да душы. Я адчуў дабразычлівую ўвагу да сябе й цяпло сямейнай атмасфэры, пабачыў камфорт нармальнага жыцьця. Але адначасна мяне скаланула ад думкі, што ўва ўсім гэтым тоіцца й злавесная прорва, якая можа паглынуць цябе ўсяго з тваімі мроямі, жаданьнямі, далёкімі мэтамі ды сьветлымі спадзяваньнямі для свайго народу.

*25.1.50*

*У Бэльгію паслалі на гэтым тыдні ліст зьместу, прыблізна, такога: „Адказвайце без пацяшаньняў: так або не. На гэты сэмэстар ехаць ужо запозна. Чакаць далей немагчыма, бо ўсё амаль ужо спараліжована". На гэтым тыдні мо будзе ўжо адказ. Барджджэй бы хоць што-небудзь ды больш канчатковае!..*

## У дарозе назад на кантынэнт

*27.1.50*

*Усё дагары нагамі: і лекцыі на піяніна, і калішні баян (які я хацеў набыць), і мірыяды іншых маленькіх плянікаў. Заміж іх зарысоўваецца адзін вялікі, гэткі вялікі, што калі падумаеш, дык адчуваеш галавакружэньне – Бэльгія, унівэрсытэт, навука! Учора Рагуля прыслаў тэлеграму, што атрымана 9 візаў (а нас-жа 11!) /пра жанатага Алеся Буту ў гэтым выпадку ня думалася, дый закончанае сярэдняе асьветы ў яго ня было/. Ліст у дарозе.*

*Так, цяпер трэба рыхтавацца да новых абставінаў, да новага цяжкога, але захапляльнага этапу.*

*Стараюся менш мроіць, бо са страшэннае вышыні гэтых мрояў, калі глянеш уніз і падумаеш, што яшчэ так лёгка паляцець галавой далоў, дык робіцца жудасна. Усе гэныя пляны й плянікі, якія ўчора былі, здаецца, гэткімі яснымі й канкрэтнымі, сяньня выдаюцца бледнымі, далёкімі, нерэалістычнымі. За апошнія два гады ўжо колькі разоў прыходзілася пераменьваць сваю пазыцыю адносна вось гэтых дзіўных гадунцоў ляту-ценьняў – плянаў і плянікаў будучыні.*

*18.2.50*

*Візы зробленыя. За тры тыдні выяжджаем. Дзякаваць Богу! Два гады чаканьня… (…) Тры тыдні яшчэ… Трэба скончыць чытаць „Леанарда да Вінчы”.*

*3.3.50*

*У бараку хаос: замазваюць шчыліны. (…)*

*Дзянькі ў шахце дабіваюцца – яшчэ тыдзень і good-bye!*

*Сяньня яшчэ схаджу на апошнюю лекцыю практыкі на піяніна; далей прыдзецца перарваць. За гэтыя няпоўныя сем тыдняў сёе-тое навучылася. Калі далей ня прыдзецца на піяніна, буду практыкаваць на акардыёне. (…) Апошні тыдзень пройдзе ў спакоўваньні ды пісаньні сяму-таму лістоў.*

*Цягнік на Лёндан, 11.3.50*

*Збылося! Цягнік поўным ходам чэша на Лёндан. Толькі што разьвіталіся зь Лёнькам (Швайчуком), Піліпам (Дзехцярам), Майкам і Сяргеем (двое ўкраінскіх сяброў). З рэштай паразьвіталіся ў капальні, у гостэлі, па дарозе. Няпэўнасьці больш няма. Віза ў кішэні.*

*У нядзелю прыяжджаў а. Часлаў (Сіповіч). Адслужыў у гостэлі абедню, прачытаў рэфэрат, пагаварылі, пайгралі ў шахматы.*

*Цэлы тыдзень хадзіў, як хвараваты – ня то што фізычна, але неяк… можа гэта яшчэ ўсё тая няпэўнасьць была.*

*Учора разьвіталіся ў шахце. Жылося, як жылося, але разьвіталіся… ну, што казаць – за два гады зжыліся. Заступнік мэнаджэра казаў, што калі прыдзецца крута, дык Drop a word to the Unit /напішэце слоўца ў адміністрацыю/, ну й дадуць у шахце месца йзноў. Ня дай Бог, але й гэткая магчымасьць не зашкодзіць – хто ведае…*

*11.3.50*

*Вось і Лёндан. Я з Паўлюком начуем у дзядзькі Базыля /Варгана/; чатырох – у а. Часлава, рэшта – у Беларускім Доме. Карась з Васем прыехалі недзе пазьней, пабачымся заўтра.*

*Цэлы вечар прахадзіў з Алесем Н. па Лёндане. Пачалі ад агляду ўнівэрсытэцкага кварталу. Бачыў найпрыгажэйшы будынак Лёндану – пачаты перад вайной і яшчэ ня зусім закончаны 20-павярховы ўнівэрсытэцкі гмах. Адтуль падаліся на Трафальгарскі Пляц. Алесь аглядаў калёну Нэльсана. Між іншага, ён з Аморам плянуюць аднае начы залезьці наверх калёны – ідэя вар’яцкая й недасягальная (відаць, міжнародную сэнсацыю зрабіць захацелі).*

*Адтуль пайшлі аглядаць рэклямы на Piccadily Circus. Надзвычайная рэч гэтыя рэклямы – проста цэлыя сьветлавыя сэансы. Наступны быў Leicester Square і нарэшце — Marble Arch – знаная лёнданская „Вольная трыбуна” ля самага Hyde Park. Гэта сапраўды цікавая характэрная зьява,*

сказаў бы — сэрца ангельскае свабоды. Кучкі народу, пазьбіраўшыся з усяго Лёндану, а мо й зь іншых месцаў, вядуць гутаркі й спрэчкі на ўсе тэмы. Каталікі, атэісты, Армія Ратаваньня, кансэрватары, баптысты, камуністы, сацыялісты й усякія іншыя „ысты" й „істы" вядуць гутаркі на самыя розныя тэмы. Любата проста хадзіць ад кучкі да кучкі й прыслухоўвацца, аб чым людзі так горача з запалам, абзываючы адзін аднаго ілгунамі й рознымі іншымі мянушкамі, выказваюць свае пагляды на рэчы. Свабода! (…)

13.3.50

Цягнік Лёндан—Доўвэр.

Два вечары ў Лёндане праскочылі, як мігнуць. Учора йзноў бадзяліся ўвесь вечар, але ўжо цэлай кучай, акрамя Дзімітрука. Ну і, зразумела, Надсон з намі. Яшчэ раз кінулі вокам на Пікадылі, на рэклямы, суцэльную масу лімузынаў, густы натоўп, перасыпаны постацямі намалёваных і напудраных жаночых фігураў, што выйшлі зарабляць свой начны хлеб.

Перад гэтым былі ў Нацыянальнай галерэі партрэтаў, а пасьля ў Мастацкай галерэі. Нарэшце пабачыў Рэмбрандта, Рубэнса, Ван Дэйка, Рафаэля й іншых. Ня ўсьпеў пабачыць Леанарда да Вінчы, бо хадзіў сам бясплянава. А глядзець ёсьць што. Гадзінамі й гадзінамі будзеш хадзіць, як зачараваны, углядаючыся ў пяцісотгадовыя малюнкі. З галерэяў езьдзілі ў катэдру сьв. Паўла. Якраз была вячэрня. Народу жменька. Усярэдзіне выглядае зусім просьценька, прыгожая затое звонку. Далей былі на Fleet Street



ф4-2 (30)

Лёнданцы, у тым ліку а. Чеслаў Сіповіч (у чорным паліто), на чыгуначным вакзале „Вікторыя" праводзяць сяброў Дванаццаткі на навуку ў Лювэн 13 сакавіка 1950 г.

*– пульс брытанскае прэсы, дзе разьмешчаня бальшыня газэтных друкарняў, рэдакцыяў. Будынак „Дэйлі Экспрэс" зроблены з чорнае бліскучае кафлі – так і дыхае на цябе эпохай атамнай бомбы. Далей пайшлі: найвышэйшы ангельскі суд – Appeal Court, дзялянка ўрадавых будынкаў, кансулятаў і інш. Закончылі ўсё Marble Arch'ам. Гэты раз народу было шмат больш. Наканец трапілі ў бар. Ну, пад'яжджаючы да Доўвэру, трэба канчаць…*

*13.3.50*

*Параплаў „Прынц Філіп".*

*Мінула 12-я гадзіна. Мытная праверка заключалася ў стаўляньні значкоў на валізках і больш нічагуткі. Пагода надзвычайная. Дзень страшэнна падобны пад гэны, калі мы ўяжджалі сюды ў 48-м годзе, хоць было тады ў студзені. Трэба будзе зараз разгледзецца на караблі, выдаць рэшту ангельскага серабра, каб не змарнавалася. Два гады шахты ўжо аддзяляе ад нас вада Ля-Маншу… Адна лекцыя – лекцыя працы – скончаная. Пачнецца хутка іншая — можа назваць яе лягчэйшай – цікавейшая, бо больш самастойная. З клубка пачуцьцяў можна было б верш склеціць, але яшчэ адчуваюся зарастрэсеным, каб канцэнтравацца над рыфмай. Мора гладкае, зялёнае, песьціцца ў сонечных праменьнях. Карабель ідзе плаўна, лёгка. Цікава, ці гэтак гладка пойдзе ў нас па гадох навукі на ўнівэрсытэце.*

*Айцец Часлаў мусіць-ткі ўгаварыў мяне йсьці на літаратуру. Мучыць толькі думка (ды ня так ужо назойліва), што, калі пайду, дык ці пападу туды, куды цаляю, хоць адчуваю крыху веры ў свае сілы.*

*Крыху пазьней 13.3.*

*Едзем ужо больш за тры гадзіны. Хутка будзем у Остэндэ. У імгле ўжо відаць берагі новае, часовае, як і ўсе яны, бацькаўшчыны. Надварэ пахаладнела. Хлопцаў паразьбіраў сон. Усе выглядаюць змучана. Ну, нічога – а 9-й, калі будзем трапляць на час на ўсе цягнікі, будзем ужо на месцы. (…)*

*Міжнародны цягнік Остэндэ — Вена. 13.3.*

*Ізноў праверкі ня было ніякае. Папрасіў мяне адчыніць партфэль, а Жука – валізку. І гэта ўсё. За цягнік трэба было даплачваць па 10 франкаў. Мусіў абмяняць фунты на франкі. Заразы, зьдзіраюць па 110 за фунт, калі можна ў іншым месцы прадаць па 140.*

*Так, на кантынэнце йзноў. У Брусэлі перасадка на Лювэн. У Брусэлі хіба што Рагуля спаткае нас.*

*Надварэ шарэ. Прыедзем недзе позна вечарам. (…)*

*Хлопцы спрачаюцца, што лепш любіць: Ангельшчыну ці Бэльгію. Па-мойму, для нас тое самае. Бэльгіі, фактычна, мы яшчэ амаль ніяк ня ведаем.*

У красавіку 1950 г. „Беларус на Чужыне" (№18) падаў вестку:

### З вуглякопаў на ўнівэрсытэт

13 сакавіка 1950 г. дзевяць маладых хлапцоў выехала з Англіі ў Бэльгію ў Лювэн на вышэйшыя студыі, усе з „Дванацаткі"; месяц пасьля выехалі туды яшчэ сп.сп. Кукель (Часлаў) і Цімафейчык (Тодар).

Такім чынам 11 чалавек зь беларускай моладзі, што дагэтуль капалі вугаль у падзямельлі або былі наймітамі ангельцаў, маюць змогу здабываць вышэйшую асьвету.

KAMUNIKAT.org